гратэск наравісты, капрызны, вычварны, мудрагелісты, у якім сумяшчаюцца элементы сатыры, фантастыкі, шаржу, умоўнасці.

**Вайцюк Л.А.,**
*аспірантка кафедры*
*харавога мастацтва*

## АБ ЭСТЭТЫЧНЫМ ВЫХАВАНН ПАДЛЕТКАЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Сацыяльная, эканамічная, палітычная, культурная сітуацыі, што склаліся цяпер у нашым грамадстве, патрабуюць пераацэнкі самой сутнасці працэсу выхавання падрастаючага пакалення. Гэта правамерна таму, што ва ўмовах агульнага крызісу ідэй заўсёды адбываецца перагляд асноўных паняццяў педагогікі, перш за ўсё паняцця выхавання.

Шматлікія пераўтварэнні ў грамадстве далі магчымасць педагогам пераасэнсаваць работу з дзецьмі, падлеткамі, абнавіць характар, змест, тэхналогію выхаваўчай работы. Гэтаму садзейнічаюць асноўныя прынцыпы сучаснай дзяржаўнай палітыкі ў галінах выхавання, адукацыі. Яны знайшлі сваё адлюстраванне ў законах “Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь”, “Аб правах дзіцяці”, ва ўстаноўленым Міністэрствам адукацыі “Прыкладным палажэнні аб агульнаадукацыйнай школе”, распрацаваных Нацыянальным інстытутам адукацыі “Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі”, “Канцэпцыі выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі”. Новыя сацыяльна-эканамічныя, культурна-педагагічныя ўмовы патрабуюць новых падыходаў, тэхналогій. Апошнія павінны адпавядаць сучаснаму моманту, цяперашнім грамадскім каштоўнасцям.

У сацыяльным, культурным жыцці беларускага грамадства адбываецца адраджэнне нацыянальных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, мовы. У працэсе фарміравання асобы неабходна адраджаць выхаванне ў высокім значэнні слова. Яно мусіць абапірацца на класічную педагогіку, сусветны вопыт, педагагічны фальклор, адвечныя традыцыі, дасягненні сусветнай культуры.

Катэгорыя выхавання — адна з асноўных у педагогіцы. Тым не менш да сённяшняга дня ўсё яшчэ няма агульнапрызнанага яе вызначэння. Калі пад словам "выхаванне" раней мелі на ўвазе павучанне, "падгонку" дзіцяці пад патрэбны стандарт, дык ад гэтага зараз мы павінны ўжо катэгарычна адмаўляцца.

У сучасных тэорыі і практыцы з улікам вопыту сусветнай педагогікі выхаванне разглядаецца як працэс развіцця асобы, адносін яе да навакольнага свету, фарміравання ў чалавеку культуры, маралі, стварэння ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы. У "Канцэпцыі выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі" адзначаецца, што выхаванне — гэта мэтанакіраванае фарміраванне ў асобы адпаведных адносін да людзей, навакольнай рэчаіснасці. Пры гэтым удакладняецца: фарміраванне трэба разглядаць не як вонкавы ціск на асобу, а як абуджэнне яе ўнутранай патрэбнасці ў адпаведных мысленні, дзейнасці, пачуццях.

Вялікую ролю ў фарміраванні маральнасці, культуры чалавека адыгрываюць мастацтва, эстэтычнае выхаванне. Мастацтва (асабліва музыка, мастацкая літаратура) з'яўляецца магутным сродкам духоўнага ўзвышэння чалавека. Яшчэ Арыстоцель пісаў, што музыка можа ўздзейнічаць на эстэтычны бок душы, а паколькі яна мае такую сілу, то павінна быць уключана ў лік прадметаў выхавання моладзі.

Уздзеянне мастацтва на выхаванне чалавека ў значнай меры залежыць ад яго мастацка-эстэтычнага развіцця. Неабходна падкрэсліць, што без ведання законаў мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, разумення мовы, выразных яе сродкаў мастацтва не абуджае глыбокіх

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

пачуццяў і думак. Каб адчуць прыгажосць, напрыклад, харавога спеву, трэба ведаць яго характэрныя асаблівасці, разумець мову музыкі, вакалу, з дапамогай якіх кампазітар, выканаўцы перадаюць адценні пачуццяў, уздзейнічаюць на слухачоў. Успрыманне паэзіі, выяўленчага мастацтва таксама патрабуе адпаведнай падрыхтоўкі.

Эстэтычную культуру неабходна выхоўваць. Эстэтычнае выхаванне мае першароднае значэнне для падлеткаў перш за ўсё таму, што ў іх узросце закладваюцца асновы культуры. Важнасць эстэтычнага выхавання падлеткаў абумоўлена яшчэ тым, што з прычыны псіхалагічнай адметнасці ўзросту ўсялякае мастацкае ўздзеянне на іх аказваецца моцным, уражальным. У гэты перыяд у падлеткаў з'яўляецца патрэбнасць у эстэтычных каштоўнасцях, сцвярджэнні сваіх інтарэсаў, ідэалаў, набыцці эмацыянальна-эстэтычнага ацэначнага вопыту ў сферах выяўленчага мастацтва, музыкі і інш.

У педагагічнай літаратуры эстэтычнае выхаванне разглядаецца як мэтанакіраванае фарміраванне густаў, ідэалаў асобы, развіццё здольнасцей яе да эстэтычнага ўспрымання з'яў рэчаіснасці, твораў мастацтва, самастойнай творчасці ў галіне мастацтва. Эстэтычнае выхаванне ўяўляе сабой сістэму, накіраваную на ўсебаковае фарміраванне асобы, развіццё яе пад уплывам паслядоўных эстэтычных уздзеянняў. Яно ажыццяўляецца ў цеснай сувязі з іншымі відамі выхавання, кантралюецца сістэмай дзяржаўных устаноў.

Сутнасць эстэтычнага выхавання неаддзельная ад яго мэты. На сучасным этапе гэтая мэта ў тым, каб, далучаючы дзяцей да пэўнай галіны мастацтва, развіваць іх здольнасць эстэтычнага стаўлення да жыцця. Чалавек з развітымі эстэтычнымі адносінамі да жыцця не адчувае сябе адасобленым, усведамляе сябе часцінкай усяго свету.

Сутнасцю эстэтычнага выхавання вызначаны яго задачы. Асноўнымі задачамі яго называюць развіццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эстэтычнага ўспрымання, здольнасці бачыць прыгожае ў прыродзе, мастацтве, выхаванне эстэтычных густу, адносін да рэчаіснасці. Цяпер задачы эстэтычнага выхавання напоўніліся новым зместам, набылі вельмі багаты сэнс: глыбока разумець, адчуваць, ацэньваць, адлюстроўваць прыгажосць мастацтва і рэчаіснасці, "свету чалавека"; фарміраваць патрэбнасці, навыкі змянення грамадства па законах прыгажосці ў адпаведнасці з ідэйна-эстэтычнымі ідэаламі. Прыгажосць, маючы велізарную прыцягальную сілу для чалавека, з'яўляецца найбольш эфектыўным пабуджальнікам яго да дзейнасці. Духоўна-эстэтычнае багацце робіць чалавека прыцягальным для іншых, яно здольнае арганізоўваць жыццё, дзейнасць, уплываць на думкі, паводзіны.

У эстэтычным выхаванні няма месца такому спосабу навучання, як "чыстая" перадача інфармацыі ад дасведчанай асобы да недасведчанай, бо выхаванне — гэта працэс дыялектычнага ўзаемадзеяння. Выкладчык, тлумачачы новую інфармацыю вучню, гэтым высвятляе ісціну і для самога сябе, паколькі аб'ектывізуе і свае патэнцыяльныя веды. Так вучань вучыцца ў выкладчыка, выкладчык — у вучня.

Спрыяльнай для зносін глебай, якая найбольш адпавядае засваенню духоўных каштоўнасцей падлеткамі, з'яўляецца мастацтва. Яно абагульняе, сістэматызуе вопыт эстэтычных адносін чалавека да рэчаіснасці, што склаўся гістарычна, перадае яго ў даступнай мноству людзей форме. Мастацтва адлюстроўвае, асэнсоўвае эстэтычныя факты рэчаіснасці. Ацэньваючы жыццёвыя з'явы, яно робіць іх прадметам эстэтычнай ацэнкі. Акрамя таго, яно выклікае эстэтычныя эмоцыі, прыносіць эстэтычную асалоду. Гэта і робіць мастацтва самым эфектыўным, проста незаменным сродкам эстэтычнага выхавання.

Эстэтычнае выхаванне сродкамі мастацтва дазваляе развіць не толькі агульную культуру, але і індывідуальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рысы асобы: назіральнасць, зрокавую памяць, пазнавальную актыўнасць. Адметнае значэнне мастацтва заключаецца ў тым, што яно дае разуменне дабра і зла, праўды і няпраўды, а без падобнага разумення эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення ажыццяўляць немагчыма. Мастацтва садзейнічае ўсведамленню чалавекам сэнсу існавання, задавальняе патрэбнасць у пашырэнні ведаў пра свет, служыць сродкам зносін.

Атрымліваючы ад мастацкіх твораў велізарную колькасць уражанняў, падлетак перапрацоўвае іх, рэалізуе ў творчай дзейнасці. Такім чынам, мастацтва выконвае важную функцыю развіцця здольнасці дзяцей да творчасці, якая потым выкарыстоўваецца імі ў вучобе, працы.

Важна, каб асоба як мага раней сустрэлася з мастацтвам. Выхаваныя з дзіцячых гадоў здольнасць адчуваць, разумець мастацтва, любоў да яго захоўваюцца на ўсё жыццё, уплываючы на фарміраванне эстэтычнага густу чалавека.

**Высоцкі Г.В.,**
*аспірант кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці*

## УЗДЗЕЯННЕ НА СІСТЭМУ КАШТОЎНАСЦЕЙ ШКОЛЬНІКАЎ ШЛЯХАМ ПАВЫШЭННЯ СТАТУСА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Каштоўнасныя арыентацыі адносяцца да такіх агульнанавуковых паняццяў, значэнне якіх для педагогікі вельмі важнае. Гэта абумоўлена тым, што галоўная функцыя каштоўнаснага арыентавання заключаецца ў забеспячэнні сувязей паміж грамадствам і асобай, а яго сэнс у тым, каб дзейнасць індывіда мела пазітыўны характар і ў сацыяльным, і ў індывідуальным планах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ